Зубчонак Н.А.
Беларускі дзяржаўны універсітэт

**М. Е. Дастанка – рэдактар Слуцкай падпольнай газеты
“Народны мсцівец”**

Слуцкая падпольная газета “Народны мсцівец” – цікавае і значнае выданне гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Газета пісала пра падзеі на франтах, ў акупіраваных раёнах, партызанскіх атрадах. На сённяшні дзень яна з’яўляецца важнай крыніцай інфармацыі пра жыццё партызан і мірных жыхароў Случчыны ў гады вайны, дае магчымасць больш даведацца пра тых людзей, якія яе стваралі і распаўсюджвалі.

Адной з такіх асоб з’яўляецца галоўны рэдактар газеты Мікалай Еўкавіч Дастанка. Усё сваё жыццё гэты чалавек актыўна працаваў як журналіст, пасля вайны звязаў свой лёс з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, стаўшы адным з заснавальнікаў кафедры тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання на факультэце журналістыкі, першым яе загадчыкам.

Нарадзіўся Мікалай Еўкавіч 20 жніўня 1917 г. у вёсцы Обчын Любанскага раёна Мінскай вобласці ў беднай сялянскай сям’і. Да 1935 г. вучыўся і працаваў ў калгасе. У 1935 г. яго, як актыўнага карэспандэнта, вылучылі на працу ў рэдакцыю раённай газеты. Там М. Е. Дастанка працаваў на пасадах загадчыка аддзела, адказнага сакратара, намесніка рэдактара. Напярэдадні вайны ўступіў у Камуністычную партыю. З пачатку 1941 г. быў прызначаны загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Целеханскага райкома партыі і рэдактарам раённай газеты ў м. Целеханы.

З першых дзён вайны застаўся ў тыле ворага. Стварыў і кіраваў падпольнай партыйна-камсамольскай групай. Калі стала немагчымым далейшае знаходжанне на падпольнай рабоце, быў адкліканы ў партызанскую зону. У партызанскім атрадзе М. Е. Дастанка быў рэдактарам лістовак, а потым кіраваў выданнем Слуцкай падпольнай газеты “Народны мсцівец”.

Першы нумар газеты выйшаў 1 красавіка 1943 г. Выданне стала друкаваным органам Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б. У склад рэдакцыі ўвайшлі таксама Локцеў П. Д., Куляшоў І. В., Канановіч І. С. (сакратар Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б). Вакол газеты быў створаны значны аўтарскі калектыў, які налічваў больш за 120 чалавек. На востраве ў Загальскіх балотах (Любанскі раён) працавала друкарня партызанскай брыгады № 64 імя Чкалава.

Газета мела звычайнае для таго часу афармленне: уверсе характэрныя лозунгі “Смерць нямецкім акупантам!”, “Прачытаў – перадай другому”. Далей змяшчаліся вытрымкі з прамоў кіраўнікоў партыі, часцей Сталіна. Абавязковымі былі рэдакцыйныя артыкулы з характэрнымі назвамі “Паднімайся на барацьбу”(1943, 3 чэрвеня), “Усе

сілы на разгром ворага" (1943, 13 чэрвеня), "Шлях барацьбы і перамог"(1944, 1 студзеня).

Усяго ў тыле ворага было выпушчана 78 нумароў газеты агульным тыражом 37 300 экз. У 1943 г. – 53 нумары, у 1944 – 25. Апошні нумар выйшаў 25 чэрвеня 1944г. Таксама было выдадзена 72 000 экз. лістовак і адозваў.

У справаздачы Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б Мінскаму абкому КП(б)Б аб праведзенай рабоце за перыяд з чэрвеня 1943 г. па май 1944 г. адзначалася, што рэдакцыяй газеты "Народны мсцівец" за перыяд яе працы з красавіка па 1 жніўня 1943г. выпушчана 17 965 экз. газеты і лістовак. Газета выходзіла кожны тыдзень агульным тыражом 250–300 экз. За адзін толькі чэрвень выдадзена і выпушчана 1900 экз. газеты і 8 700 экз. лістовак. Лістоўкі выпускаліся на тэмы: "Весткі з фронту", " Весткі з Савецкай Радзімы ", "Да паліцэйскіх і асоб, што знаходзяцца на службе ў немцаў", "Да моладзі Слуцкага раёна", "Да працоўных Слуцкага раёна", "Да чэхаў і славакаў", быў размножаны першамайскі загад Сталіна.

З цягам часу аб'ём газеты павялічваўся. У 1944 г. "Народны мсцівец" выдаваўся ўжо на 4-х палосах замест 2-х. Больш разнастайным стаў змест. Шмат матэрыялаў было прысвечана выкрыццю намераў захопнікаў стварыць на Беларусі розныя прафашысцкія арганізацыі, у прыватнасці "Беларускую краёвую абарону", "Саюз беларускай моладзі". Газета пісала пра мінулае і будучыню Случчыны, увяла рубрыку "Слуцкія людзі", дзе расказвала пра подзвігі сваіх землякоў.

У нумары за 1 студзеня 1944 г. змешчана паведамленне, што ў друкарні "Народнага мсціўца" выйшла кніга вершаў А. Астрэйкі "Слуцкі пояс". Выданне было добра мастацкі аформлена партызанамі С. Залатым і С. Бяляевым. Гэта ўнікальны ва ўсёй тагачаснай паэзіі зборнік. Самыя лепшыя вершы (іх 22) былі сабраны ў асобнае выданне. Пасля баявой сутычкі з ворагам партызаны займелі паперу, выразалі драўляныя застаўкі, замест фарбы выкарысталі ваксу з сажай.

Выданне пачыналася прысвячэннем аўтара: "Прысвячаю Слуцкім партызанам брыгады імені Чкалава". Прадмову да зборніка напісаў сакратар Слуцкага падпольнага раённага камітэта КП(б)Б І.Кананові. У кнізе змешчаны такія вершы, як "Беларусь партызанка", "Час расплаты", "Песня разведчыка", "Наперад" і інш.

"У мяне як самая дарагая рэліквія захоўваецца падшыўка камплекта газет і лістовак Слуцкай падпольнай рэдакцыі. Асобныя з іх надрукаваны на аркушах са школьных сшыткаў, шпалерах і іншай паперы, пажоўклай ад часу...", – успамінаў пасля вайны М.Е. Дастанка (4). Захаваўшыяся да сённяшняга дня нумары "Народнага мсціўца" з'яўляюцца сапраўды бясцэнным гістарычным матэрыялам, помнікам

беларускаму народу ў яго барацьбе супраць фашызму. Выданне такой газеты сведчыла не толькі пра высокі прафесіяналізм рэдактара, але і пра  мужнасць, самаадданасць гэтага чалавека.

М. Е. Дастанка зрабіў вельмі шмат, каб падпольная газета стала сапраўды змястоўным, цікавым выданнем, а галоўнае – несла сваім чытачам тую інфармацыю, якая абуджала лепшыя  патрыятычныя пачуцці. Успаміны галоўнага рэдактара вельмі дапамаглі і сучасным гісторыкам у падрыхтоўцы да выдання кнігі “Памяць. Слуцкі раён”.

Пасля заканчэння вайны Дастанка М. Е. працягваў актыўна працаваць у журналістыцы. Ён быў рэдактарам Вяцкай раённай газеты, намеснікам рэдактара Бабруйскай абласной газеты, рэдактарам “Чырвонай змены”, “Настаўніцкай газеты”, уласным карэспандэнтам газеты “Известия” на БССР.

У перыядычным друку шмат яго публіцыстычных артыкулаў і навуковых прац. Ён быў даследчыкам гісторыі беларускага друку, гісторыі і тэорыі тэлебачання і радыё. У 1967 у Маскве М. Е.Дастанка абараніў кандыдацкую дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, у 1969 г. атрымаў званне дацэнта. З 1967 па 1975 гг. загадваў кафедрай тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання на факультэце журналістыкі БДУ.